На Віцебшчыне сустрэліся з грамадзянамі «залатога ўзросту»

09.01.2023 16:04 **Аўтар: Аляксандра Гвоздзева (/be/author/alyaksandra-gvozdzeva)** **Грамадства (/be/gramadstva)**

Да рэспубліканскай акцыі «Ад усёй душы», арганізатарамі якой выступілі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Міністэрства адукацыі сумесна з грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя», далучылася Віцебшчына. Напярэдадні Раства намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Дурноў сустрэўся з грамадзянамі «залатога ўзросту» і работнікамі сацыяльнага абслугоўвання паўночнага рэгіёна.

(ht



«У Віцебскай вобласці пражывае звыш 260 тысяч пажылых людзей, звыш 20 тысяч адзінокіх і 140 тысяч, якія жывуць асобна. Многія з іх, нягледзячы на ўзрост, займаюць актыўную грамадзянскую пазіцыю і гатовы перадаць свае веды і жыццёвы вопыт маладому пакаленню. Прыемна, што і моладзь у сваю чаргу ідзе насустрач такому ўзаемадзеянню. Таму я ўпэўнены, што акцыя «Ад усёй душы» і далей будзе актыўна падтрымлівацца і знойдзе самае шырокае распаўсюджанне», — адзначыў у прывітальным слове Вячаслаў Віктаравіч.

> У зале Віцебскага аблвыканкама напярэдадні свята сабралася больш як 100 гасцей: пенсіянеры-актывісты, дырэктары тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, прадстаўнікі саветаў пажылых грамадзян, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў. Амаль кожны не прамінуў адзначыць непарыўную сувязь акцыі «Нашы дзеці» і «Ад усёй душы»: пераемнасць пакаленняў заўсёды была адным з інструментаў будаўніцтва сацыяльнай палітыкі нашай краіны. У святочныя дні становіцца добрай традыцыяй акружаць клопатам і ўвагай не толькі дзяцей — нашу светлую будучыню, але і тых, хто сваёй працай доўгія гады складаў моцны падмурак для іх шчаслівага дзяцінства.

Аб сінтэзе жыццёвай мудрасці людзей «залатога ўзросту» і моладзевага запалу, вынікам якога з'яўляецца выхаванне падрастаючага пакалення на любові да сваёй радзімы, на асаблівым вопыце ведае **старшыня савета пажылых грамадзян Віцебскага раёна Людміла Нікіціна.** Пад яе кіраўніцтвам у аграгарадку Заронава ўжо 37-мы год працуе народны комплексны музей «Гісторыя Заронаўскага краю», вядомы не толькі ў рэспубліцы, але і ва ўсіх рэгіёнах былога Савецкага Саюза. Пераемнасць пакаленняў ва ўстанове зараджалася разам з музеем у далёкім 1986 годзе: навучэнцы мясцовай школы пад кіраўніцтвам Нікіцінай даглядалі воінскі мемарыял, на якім пахавана звыш 10 тысяч воінаў, займаліся вяртаннем з небыцця імён герояў-вызваліцеляў, вялі экскурсіі, дапамагалі мясцовым ветэранам вайны і працы. Гэта добрая традыцыя доўжыцца і па сённяшні дзень, на змену падрастаючаму ў музеі пакаленню прыходзяць новыя экскурсаводы, выхаваныя на вывучэнні гісторыі роднага краю і патрыятызме. На краязнаўчай ніве Людміле Канстанцінаўне сёння дапамагае сын Станіслаў, разам яны з'яўляюцца захавальнікамі музейных каштоўнасцяў.

(ht



Старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама Аляксандр Хрыстафораў на сустрэчы падкрэсліў, што ўся сацыяльная работа ў вобласці накіравана на паляпшэнне якасці жыцця ветэранаў, пажылых грамадзян і людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Зараз на Віцебшчыне працуюць 254 сацыяльныя мабільныя пункты, якія створаны з мэтай аказання паслуг жыхарам аддаленых населеных пунктаў. Функцыянуюць 157 аддзяленняў дзённага знаходжання, у якіх пенсіянеры займаюцца ў гуртках па інтарэсах: спяваюць, асвойваюць камп'ютары, займаюцца фітнесам. Для многіх адзінокіх пажылых грамадзян аддзяленні дзённага знаходжання становяцца другім домам, месцам, дзе можна сабрацца разам з сябрамі і адчуць сябе патрэбным.

Прадстаўнікі Расонскага ТЦСАН выказалі надзею, што акцыя «Ад усёй душы» атрымае шырокае распаўсюджанне, актывізуе работу з пажылымі людзьмі, дапаможа адчуць ім смак жыцця. Лідар абласной маладзёжнай арганізацыі Уладзімір Бабічаў запэўніў, што моладзь паклапоціцца аб фізічнай і маральнай падтрымцы, члены БРСМ ужо правялі звыш 50 дабрачынных мерапрыемстваў у навагоднія дні, наведаўшы з канцэртамі і падарункамі многія сацыяльныя ўстановы Віцебшчыны.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА

Фота: «Витебские вести»

Чытайце таксама

На маршруце «Марафону адзінства» — Жлобін (/be/news/20241025/1729869680-na-marshruce-marafonu-adzinstva-zhlobin)

Жлобін рыхтуецца сустракаць удзельнікаў «Марафона адзінства» (/be/news/20241024/1729769547-zhlobin-ryhtuecca-sustrakac-udzelnikau-marafona-adzinstva)

«Трэба імкнуцца жыць хораша» (/be/news/20241022/1729602010-treba-imknucca-zhyc-horasha)

Сям'я — аснова грамадства (/be/news/20241021/1729519861-syamya-asnova-gramadstva)

«Марафон адзінства» ў Гомелі. Дзень другі (/be/news/20241019/1729339405-marafon-adzinstva-u-gomeli-dzen-drugi)

Тэгі: Віцебская вобласць (/be/tags/vicebskaya-voblasc) | «Ад усёй душы» (/be/tags/ad-usyoy-dushy) | акцыя (/be/tags/akcyya)

599 праглядаў Русский (/ru/news/20230109/1673273691-na-vitebshchine-vstretilis-s-grazhdanami-zolotogo-vozrasta) Друкаваная версія (/be/print/267956)

Падзяліцца:

(https://vk.com/share.php?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20230109%2F1673269456-na-vicebs
(https://connect.ok.ru/offer?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20230109%2F1673269456-na-viceb
(https://twitter.com/intent/tweet?text=%D0%9D%D0%B0%C2%A0%D0%92%D1%96%D1%86%D0%B5%D0%B1%D1%
(viber://forward?text=%D0%9D%D0%B0%C2%A0%D0%92%D1%96%D1%86%D0%B5%D0%B1%D1%88%D1%87%D
(https://t.me/share/url?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20230109%2F1673269456-na-vicebshchy

Навіны | Папулярнае

14:27 Кухараў: Пагадненне з Цындаа дасць штуршок развіццю нашых адносін у розных сферах (/be/news/20241026/1729942034-kuharau-pagadnenne-z-cindaa-dasc-shturshok-razviccyu-nashyh-adnosin-u)

13:57 Мінскі трактарны завод на восеньскіх канікулах наведаюць каля тысячы школьнікаў (/be/news/20241026/1729940220-minski-traktarny-zavod-na-vosenskih-kanikulah-navedayuc-kalya-tysyachy)

13:25 Іран праінфармаваў Ізраіль, што не будзе рэагаваць на атаку (/be/news/20241026/1729939275-iran-prainfarmavau-izrail-shto-ne-budze-reagavac-na-ataku)

12:56 Каля 30 тыс. беларусаў ужо прынялі ўдзел у акцыі «Дай лесу новае жыццё!» (/be/news/20241026/1729936570-kalya-30-tys-belarusau-uzho-prynyali-udzel-u-akcyi-day-lesu-novae-zhyccyo)

(https://www.butb.by/)

12.24 Каранік пра акцыю «Дай лесу новае жыццё!»: Гэта яскравы прыклад захавання лепшых традыцый беларусаў (/be/news/20241026/1729934658-karanik-

УСЕ НАВІНЫ (/BE/NEWS)

Іншыя матэрыялы аўтара

Пад дубовымі галінамі стагоддзяў (/be/news/20241025/1729866750-pad-dubovymi-galinami-stagoddzyau)

«Адзін раён — адзін праект» — імпульс развіцця (/be/news/20241023/1729708796-adzin-rayon-adzin-praekt-impuls-razviccya)

«Трэба імкнуцца жыць хораша» (/be/news/20241022/1729602010-treba-imknucca-zhyc-horasha)

Сям'я — аснова грамадства (/be/news/20241021/1729519861-syamya-asnova-gramadstva)

Чым ганарацца эколагі Віцебшчыны? (/be/news/20241017/1729161114-raman-kolca-nasha-pershasnaya-zadacha-vyhavac-berazhlivyh-uvazhlivyh-da)

(https://www.buth.by/)

Выбар рэдакцыі

(/be/news/20241022/1729612264-byazlitasny-agon)

Грамадства (/be/gramadstva)

Бязлітасны агонь (/be/news/20241022/1729612264-byazlitasny-agon)

Чаму павялічваецца колькасць пажараў у жылфондзе?

0 102

(/be/news/20241024/1729778938-yuryy-alyaksey-listapad-plyacouka-dlya-peragavorau-i-papulyaryzacyi)

Культура (/be/kuttura)

Юрый Аляксей: «Лістапад» — пляцоўка для перагавораў і папулярызацыі беларускай кінапрадукцыі» (/be/news/20241024/1729778938-yuryy-alyaksey-listapad-plyacouka-dlya-peragavorau-i-papulyaryzacyi)

Інтэрв'ю з генеральным дырэктарам нацыянальнай кінастудыі.

0 51

(/be/news/20241022/1729611792-novy-poglyad-na-rallyu)

Сельская гаспадарка (/be/selskaya-gaspadarka)

Новы погляд на раллю (/be/news/20241022/1729611792-novy-poglyad-na-rallyu)

Навуковец расказаў аб перавагах і магчымых «падводных камянях» безадвальнай апрацоўкі глебы.

0 115

(/be/news/20241023/1729709330-shto-zmenicca-u-sfery-adukacyi)

Грамадства (/be/gramadstva)

Што зменіцца ў сферы адукацыі? (/be/news/20241023/1729709330-shto-zmenicca-u-sfery-adukacyi)

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі ў першым чытанні законапраект «Аб змене законаў па пытаннях адукацыі»

(https://www.butb.by/)

0 129

Нашы партнёры:

(https://center.gov.by/) (http://mininform.gov.by/ru/) (http://pravo.by/) (http://www

(/)

ПАДПІСКА (/BE/SUBSCRIPTION)

© 1998—2024 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ "Выдавецкі дом "Звязда".
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Газета "Звязда" (/be/edition)
Рэклама (/be/advertising)
Праекты (/be/projects)
Архіў (/be/pdf)
Экстрэмісцкія матэрыялы (/be/page/respublikanski-spis-ekstremisckih-materyyalau)

Палітыка (/be/palityka)
Эканоміка (/be/ekanomika)
Грамадства (/be/gramadstva)
У свеце (/be/u-svece)
Культура (/be/kultura)
Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)
Спорт (/be/sport)
Нашы выданні (http://zviazda.by/be/about)
Кнігі (http://zviazda.by/be/page/bibliyateka-zvyazdy)

4 969
3 760
3 628
(https://metrika.yandex.by/stat/?id=37842935&from=informer)

(https://vk.com/zviazda) (https://www.instagram.com/zviazda.by/)
(https://twitter.com/zviazda) (https://t.me/zviazda_online)